## МАГУТНЫ СІМВАЛ БЕЛАРУСІ

— Лянок, які лес нашай Беларусі самы знакаміты? — Васілінка разгадвала крыжаванку.

— Гэта Белавежская пушча, — адказаў Лянок. — Так?

— Так, — пацвердзіла Васілінка. — А ты быў у Белавежскай пушчы?

— Мы ездзілі туды на экскурсію, — адказаў Лянок. — Якіх цікавых жывёл і расліны мы там убачылі! Але больш за ўсё мяне ўразіў адзін звер.

А вы здагадаліся, што гэта за звер?

Прачытайце загадку. Правільна вымаўляйце гукі [дз'], [ч], [ц'], [г]. Дадайце адгадку.



Ходзяць волаты ў бары.
Тут жывуць з сівой пары.
Пушчаў то гаспадары,
Знакамітыя ... .

*Міхась Пазнякоў.*


Правообладатель Национальный институт образования

Во́лат — асілак, велікан.
Пра́гна (углядацца) — напружана.
Гушча́р — непраходны густы лес.
Ка́рак — шыя.

Прачытайце назву тэксту. Разгледзьце малюнак. Пра якіх гаспадароў пойдзе размова?

## Гаспадар пушчы

*Віталь Вольскі*

Трашчы́ць галлё. З шумам і фырканнем пра-дзі-ра-е-цца з не-пра-хо-дна-га гушчару нешта вялікае і ду́жае. Хі-ста́-ю-цца маладыя бярозы. Пад напорам цяжкага цела ні́кне да зямлі густы падлесак.

Гэта — зубр. Вось ён выходзіць на лясную паляну, схіліўшы магутную галаву, і спыняецца, а-све-тле-ны сонцам.

Пра́гна ўглядваюся я ў ляснога волата. Не часта даводзіцца бачыць такое ві-до-ві-шча.

Увесь ён аброс густой кучаравай шэрсцю цёмна-каштанавага колеру. Яго вялікая, нізка паса́джаная галава з чорнай барадой

Правообладатель Национальный институт образования

і шырокія мускулі́стыя грудзі здзіўляюць сваёй веліччу і магутнасцю. Высокі ка́рак гарбом узвышаецца над спі́наю.

Шыя, грудзі і добрая палова спі́ны густа пакрыты цёмнай калматай грывай. Шматка́мі ўскудла́чанага ля́мцу звісае гэта грыва над шырока пастаўленымі, тоўстымі і кароткімі нагамі.

Пярэдняя частка яго моцнага тулава, цяжкая і масіўная, здаецца непаме́рна разві́тай у параўнанні з задняй, пакрытай карацейшымі і святлейшымі валасамі. Заднія ногі выглядаюць вышэйшымі і танчэйшымі за пярэднія. Хвост — як у звычайнага быка, але кароткі і тоўсты.

У ясным і ціхім лясным паветры выразна чуецца роўнае і глыбокае дыханне вялікай жывёлы.

Пастая́ўшы крыху́ на месцы, нібы ў задуменні, зубр рушыць далей, абрываючы мімаходам маладыя галінкі ясеня.

Следам за ім выходзіць на паляну ўвесь статак. Тут і маладыя зубры, і падлеткі, і дарослыя зубрыцы з цялятамі, падобнымі


Правообладатель Национальный институт образования



на буйны́х, калматых медзведзянят.

Міну́ўшы лясную паляну, зубр выходзіць на дарогу, спыняецца зноў і, пастаяўшы крыху, нібы разважа́ючы, ідзе па дарозе. За ім паслухмя́на цягнуцца астатнія. Яшчэ хвіліна — і ўсе зубры: малыя і дарослыя — зніка́юць за высокімі дрэвамі на павароце, узнімаючы клубы пылу і нага́дваючы здалёку невялікі статак звычайных кароў.

1. Прачытайце, як зубр выходзіў на лясную паляну.
2. Як выглядае зубр? Прачытайце.
3. Чаму аўтар называе зубра лясным волатам?
4. Прачытайце твор правільна і выразна.

Хто з вас бачыў зубра і дзе? Раскажыце, якім вы ўбачылі волата. Чым з’яўляецца зубр для нашай краіны?

Правообладатель Национальный институт образования